і любімай працы”», «Илья Фирсов: “Все порученные отделу задачи выполняем добросовестно”», «Наталья Денисова: “Организаторская деятельность – это мое”», «Александр Лукашенко: “Основа нашего национального характера – в человечности, сострадании, доброте, жажде справедливости”» і інш.

Лакальная прэса (раённая, ведамасная, шматтыражная, карпаратыўная) заклікана сёння стаць упоравень з чытачом, захоўваючы пры гэтым лідарскія камунікатыўныя пазіцыі, таму ўменне прачытваць маўленчую сітуацыю, прадбачыць працэс яе разгортвання, разумець суразмоўцу і прагназаваць вынікі кантактавання не перастае быць асноўнай прафесійнай якасцю журналіста.

***Уладзімір Касько***

## РУБРЫКІ І ЗАГАЛОЎКІ КАРПАРАТЫЎНАГА ВЫДАННЯ (на прыкладзе газеты холдынга «Гомсельмаш» )

Праблема рубрык у газеце на сёння застаецца недастаткова вывучанай не толькі ў беларускай, але і ў расійскай журналістыцы. А між тым яны дазваляюць сфарміраваць аснову тэматычнай мадэлі газетнага выдання, дапамагчы чытачу знайсці матэрыял на свой густ, сарыентавацца ў жанравай палітры публікацый.

Слова *рубрыка* ўпершыню з’явілася ў XVII ст. у польскай мове. Яно мае лацінскае паходжанне «*rubrica* ад *ruber*» – чырвоны. Спачатку першыя літары абзаца пісалі чырвонай фарбай, а не звычайным чарнілам. Адсюль выраз «чырвоны радок». Рубрыкамі называюць загалоўкі раздзела ў газеце, часопісе, кнізе, раздзела, падраздзела тэксту, графемы, якая дазваляе разнесці нейкія дадзеныя, інфармацыю па графах, паняццях.

Аб’ектам нашага даследавання з’яўляецца рубрыкацыя ў газеце «Сельмашевец» холдынга «Гомсельмаш» – адным з найлепшых, на наш погляд, карпаратыўных выданняў Беларусі. У 2015 г. яно адзначыла 85-гадовы юбілей, карыстаецца заслужанай павагай і аўтарытэтам у шматтысячнага калектыву беларускіх камбайнабудаўнікоў, а таксама у жыхароў Гомеля і вобласці. Ведаюць газету і ў дзясятках калектываў свету, якіх звязваюць вытворчыя, маркетынгавыя сувязі з «Гомсельмашам».

Аўтарытэт газеты залежыць ад многіх фактараў, у першую чаргу ад сувязі з чытачамі, падпісчыкамі, ад майстэрства журналістаў, ад дзейснасці і эфектыўнасці друкаванага радка. І тое, што на працягу многіх гадоў тыраж «Сельмашевца» не зніжаецца, а, наадварот, расце (сёння ён складае каля 2500 экзэмпляраў), што сярод чытачоў – людзі самых розных узростаў, прафесій, схільнасцяў, высокі працэнт моладзі, гаворыць пра многае.

Газета выходзіць два разы на тыдзень па чацвяргах і суботах фарматам А3. На яе старонках звычайна змяшчаецца каля 30 матэрыялаў, аб’яднаных рознымі рубрыкамі. Першапалоснай з’яўляецца пазнавальна-інфармацыйная «“Гомсельмаш” дзень за днём. Навіны, падзеі, факты». Як правіла, пад ёй друкуецца 5-7 інфармацый аб жыцці калектыву ці аб складніках – філіялах, гандлёвых цэнтрах, прадстаўніцтвах, размешчаных як у Беларусі, так і ў блізкім і далёкім замежжы.

Матэрыялы рубрыкі падаюцца без загалоўкаў, першае слова набіраецца больш буйным, чым тэкст, кеглем. У нумары за 15 верасня 2016 г. паведамлялася пра прафсаюзную канферэнцыю завода, пра акцыю, на якой рэалізоўваліся тавары з маркай «Гомсельмаш», пра беларуска-фінскі форум, які прайшоў у Гомелі, пра заказы Татарстана на выраб некалькіх дзясяткаў камбайнаў, пра новую лінію разліву высокатрывалага чыгуну. Акрамя таго ў гэтай рубрыцы можна было прачытаць пра візіты на завод гандлёвых прадстаўнікоў Расіі, Кітая, даведацца аб новых кадравых прызначэннях, традыцыях ушанавання землякоў – герояў вайны і працы.

Пастаяннымі першапалоснымі з’яўляюцца на старонках газеты рубрыкі «Візіты» і «Супрацоўніцтва». Матэрыялы, якія друкуюцца пад імі, падаюцца з цікавымі загалоўкамі: «Турэцкі плацдарм», «Азіяцкі інтарэс», «У край пуховых хустак», «Адрас – Казахстан», «Амурскае пасляслоўе».

Шырокі спектр розных пытанняў і праблем ахопліваюць матэрыялы, якія друкуюцца пад службовымі рубрыкамі – «Якасць працы», «Перадавы вопыт», «Выніковыя нарады», «Прафсаюзнае жыццё», «Семінар».

Актуальнымі з’яўляюцца рубрыкі, прысвечаныя выбарам Прэзідэнта, дэпутатаў парламета, гаспадарчым кампаніям, у якіх задзейнічана гомсельмашаўская тэхніка, – «Выбары», «Дажынкі», «Жніво».

Тэматычныя рубрыкі раскрываюць змест публікацый, часта аб’ядноўваюць як аднатэмныя падборкі матэрыялаў, так і цэлыя старонкі. У пастаяннай рубрыцы «Зона закона – парадак + законнасць + бяспека» выкарыстоўваюцца падрубрыкі: «102 інфармуе», «Здарэнне», «Школа Астапа Бендэра», «Прафілактыка». Матэрыялы гэтай паласы рыхтуюць журналісты газеты разам з работнікамі правапарадку Чыгуначнага раёна Гомеля, на тэрыторыі якога размяшчаецца «Сельмашевец». Жыццю згаданага вышэй мікрараёна прысвячаюцца многія матэрыялы, якія друкуюцца пад рубрыкамі «Як жывеш, мікрараён», «Дзень горада», «Да 85-годдзя завода», «31-ы мерыдыян: справы, падзеі, людзі» – сумесны праект рэдакцыі газеты «Сельмашевец» і адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля.

З высокіх трыбун часта можна пачуць крытыку ў адрас многіх СМІ, якія недастаткова ўвагі ўдзяляюць прапагандзе рабочых прафесій. У гэтым плане

«Сельмашевец» заслугоўвае пахвалы. У кожным яго нумары сустрэнеш нарысы, замалёўкі, рэпартажы, інтэрв'ю пра людзей працы, надрукаваныя пад рубрыкамі «Чалавек і яго справы», «Прафесія – сельмашавец», «Персона», «Традыцыі». Ажыўляюць рубрыкі загалоўкі матэрыялаў «Ліцейшчык», «Узыходжанне», «Быць у тонусе, або 26 гадоў за рулём», «Скаральнікі агню», «Гомсельмаш у маім лёсе», «Маладая, але не зялёная». Напісаныя ў розных жанрах, цёпла, з душой, публіцыстычна, яны не пакідаюць раўнадушным чатача. У гэтым немалая заслуга галоўнага рэдактара газеты Мікалая Дзямчыхіна – вопытнага, таленавітага журналіста, аўтара цікавых нарысаў і інтэрв'ю.

Не хлебам адзіным жыве чалавек. Пра гэта напамінаюць матэрыялы пад рубрыкамі «Аб узвышанным і зямным», «Парнас», «Літаратура ў рабочай сталоўцы». У іх расказваецца аб будаўніцтве новага праваслаўнага храма ў чыгуначным мікрараёне, змяшчаюцца творы заводскіх паэтаў і празаікаў.

Тых, хто хоча адпачыць пасля рабочай змены, зацікавяць матэрыялы, якія друкуюцца пад рубрыкамі «Дайджэст у горадзе і ў свеце», «Спорт», «Фотаконкурс у ДК», «Інфасалянка». Багатыя на цікавыя рубрыкі перадачы заводскага радыё і тэлебачання, інтэрнэту.

Значэнне рубрык павышаецца ў працэсе падрыхтоўкі кожнага нумара газеты на падставе сеткавага графіка, у якім строга вызначана іх месца і роля на розных старонках выдання.

У газету часта звяртаюцца людзі з пытаннямі, просьбамі, пажаданнямі, якія, на першы погляд, не адносяцца да кампетэнцыі заводскай шматтыражкі. Паведамляюць чытачы, напрыклад, пра дрэнны стан дарог, няўважлівыя адносіны да наведвальнікаў асобных службаў ЖКГ, перабоі на аўтобусных маршрутах. І на старонках газеты з'яўляюцца новыя рубрыкі: «Журналіст мяняе прафесію», «Газета выступіла – меры прынятыя». А гэта азначае, што «Сельмашевец» з'яўляецца па сутнасці выданнем універсальнага характару, разлічаным на абслугоўванне не толькі калектыву камбайнабудаўнікоў, але і ўсіх жыхароў Чыгуначнага раёна абласнога цэнтра.

Звыш 500 інфармацыйных паведамленняў, публікацый, тэле- і радыёрэпартажаў у рэгіянальным і рэспубліканскім друку, падрыхтаваных у юбілейным для «Сельмашевца» годзе пры ўдзеле журналістаў шматтыражкі, – такі ўклад яе творчага калектыву ў фарміраванне станоўчага вобраза газеты. Вопыт варты пераймання іншымі карпаратыўнымі выданнямі Беларусі